***Нацыянальныя героі***

# Выбітныя людзі другой паловы XX стагоддзя, якія найбольш паспрыялі развіццю беларускай нацыі

| | |
|---|---|
|  | **Генадзь Цітовіч** (1910–1986)<br>Беларускі музыказнавец, этнограф, дырыжор. Скончыў Віленскую кансерваторыю (1939). Стварыў Беларускі дзяржаўны ансамбль песні і танцу (1959, з 1964 Дзяржаўны народны хор БССР). Супрацоўнік Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР (1974-1975). Запісаў больш за 3 тыс. беларускіх (пераважна) народных песняў. Тэарэтычныя працы прысвечаны гістарычнаму развіццю беларускай народнай музыкі, беларускаму народнаму шматгалоссю, народнаму выканальніцтву. Народны артыст СССР (1968). |
|  | **Ларыса Геніюш** (1910–1983)<br>Беларуская паэтэса, празаік, грамадскі дзеяч.У 1937 годзе пераехала ў Прагу да мужа. Першы зборнік паэзіі “Ад родных ніў” выйшаў у Празе (1942). Генеральны сакратар ураду БНР на эміграцыі (1943). Арыштавана (1948), атрымала 25 гадоў зняволення ў лагерах. Прынцыпова адмаўлялася прымаць савецкае грамадзянства. Пасля вызвалення (1956) пасяліліся на радзіме мужа ў Зэльве.З дапамогай М. Танка надрукаваны яе першы ў Беларусі зборнік «Невадам з Нёмана» (1967). |
|  | **Мікалай Ермаловіч** (1921–2000) Беларускі гісторык, публіцыст, пісьменнік і паэт. Скончыў Мінскі педінстытут (1947), выкладаў беларускую літаратуру ў Маладзечанскім настаўніцкім інстытуце (1948–55). Выдаваў рукапісныя часопісы «Падснежнік» (чатыры выпускі, 1963-1964) і «Гутаркі» (50 выпускаў, 1975-76). Ахарактарызаваў Вялікае Княства Літоўскае як беларускую дзяржаву. Напісаў кнігі: «Па слядах аднаго міфа: Ці было літоўскае заваяванне Беларусі?» (1968), «Дарагое беларусам імя» (1970), «Старажытная Беларусь: Полацкі і Новагародскі перыяды» (1990), «Старажытная Беларусь: Віленскі перыяд» (1994), «Беларуская дзяржава Вялікае Княства Літоўскае» (2000). |
|  | **Васіль Быкаў** (1924–2003)<br>Народны пісьменнік Беларусі (1980), грамадскі дзеяч, Герой Сацыялістычнай Працы (1984). Скончыў Саратаўскае пяхотнае вучылішча (1943). Ваяваў на 2-м і 3-м Украінскіх франтах. Працаваў у рэдакцыі абласной газеты «Гродзенская праўда» (1947-1949, 1956–72). Зноў служыў у Савецкай Арміі (1949-1955). Член Саюза пісьменнікаў СССР (1959). Адзін з заснавальнікаў Беларускага народнага фронту (1988). Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР (1978–89) і СССР (1989– 91). Прэзідэнт Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына» (1990). Па творах В. Быкава пастаўлены кінафільмы «Трэцяя ракета (1963), «Альпійская балада» (1966), «Дажыць да світання» (1975), «Воўчая зграя» (1976), «Абеліск» (1977), «Узыходжанне” (1977), «Знак бяды” (1985), «У тумане» (2012), балет «Альпійская балада» (1967), опера «Сцежкаю жыцця» (1980). |

*Нацыянальныя героі*

# Выбітныя людзі другой паловы 20-га стагоддзя, якія найбольш паспрыялі развіццю беларускай нацыі *(працяг)*

| | |
|---|---|
|  | **Алесь Адамовіч (1926–1994)** Беларускі пісьменнік і грамадскі дзеяч. Член-карэспандэнт АН БССР. Член Саюза пісьменнікаў СССР (з 1957). Народны дэпутат СССР (1989). Дырэктар Інстытута кінамастацтва ў Маскве (з 1987). Аўтар навуковых прац «Шлях да майстэрства: Станаўленне мастацкага стылю К. Чорнага» (1958), «Культура творчасці» (1959), «Беларускі раман» (1961), і інш. Аўтар раманаў «Война под крышами» і «Сыновья уходят в бой», «Хатынская аповесці» (1972) і аповесці «Каратели ...» (1981), сцэнарыст фільма «Иди и смотри» (1985). Адзін з аўтараў кніг «Я з вогненнай вёскі» (з Брылём, Калеснікам, 1975) і «Блокадной книги» (з Д.Граніным, 1979). Адным з першых падняў у літаратуры тэму Чарнобыльскай катастрофы. |
|  | **Уладзімір Караткевіч (1930–1984)** Беларускі паэт, празаік, драматург, публіцыст, перакладчык, сцэнарыст, класік беларускай літаратуры. Адна з найбольш яскравых постацяў у беларускай літаратуры. Скончыў Кіеўскі дзяржаўны ўніверсітэт(1954). Пісаў пра трагедыю і веліч нацыянальнай гісторыі свайго народа, пра яго культуру, аказаў вялікі ўплыў на грамадскае, эстэтычнае і духоўнае жыццё беларускага народа. Найбольш вядомыя творы аўтара, аповесць “Дзікае паляванне караля Стаха”, раманы: “Каласы пад сярпом тваім”, “Хрыстос прызямліўся ў Гародні”, “Чорны замак Альшанскі”. Аўтар паэтычных зборнікаў “Матчына душа”, “Вячэрнія ветразі”, “Мая Іліяда”, “Быў. Ёсць. Буду”. |
|  | **Уладзімір Мулявін (1941–2003)** Беларускі артыст, кампазітар, народны артыст Беларусі (1979), народны артыст СССР (1990). Вучыўся ў Свярдлоўскім музычным вучылішчы (1956), працаваў музыкам у розных абласных філармоніях (1958-1963). У 1963 годзе быў запрошаны на працу ў Беларускую дзяржаўную філармонію. Пасля сканчэння службы ў войску (1965–67) вярнуўся ў Беларускую дзяржаўную філармонію, пры якой стварыў вакальна-інструментальны ансамбль «*Лявоны*» (1968, “Песняры” з 1970). |